# ТВОРЧАЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ ПАЭТА ВЯЧАСЛАВА РАГОЙШЫ

**Г. К. Тычко**

*Доктар філалагічных навук, прафесар.*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*tychko@mail.ru*

*У артыкуле разглядаецца паэтысная творчасць Вячаслава Рагойшы, увасобленая ў кнізе «Полюс цяпла» (Мінск: Кнігазбор, 2007). Вызначаецца ідэйна-мастацкая своеасаблівасць гэтай творчасці, аналізуюцца асобныя вершы, звяртаецца ўвага на іх фармальныя прыкметы, віды, жанры. Рабяцца высновы пра ўклад Вячаслава Рагойшы не толькі ў паэзіязнаўства, але і ў саму паэзію.*

***Ключавыя словы***: Вячаслаў Рагойша; зборнік «Полюс цяпла»; паэзія; змест і форма; патрыятычная тэматыка; інтымная лірыка; жанры; віды верша; санет; брахікалан.

Беларуская паэзія сёння прадстаўлена шматлікімі і непаўторнымі індывідуальнасцямі. Жыве і пастаянна актуалізуецца наша вялікая класіка – творы Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Якуба Коласа, Максіма Танка і інш., але ўвесь з’яўляюцца і новыя імёны, каб заззяць непагаснымі зоркамі на нацыянальным паэтычным небасхіле.

У беларускім літаратурным полі ёсць «Паэтычны слоўнік» В. П. Рагойшы, якім на працягу дзесяцігоддзяў карыстаюцца шматлікія кагорты школьнікаў, студэнтаў, вучоныя, паэты і звычайныя аматары літаратуры. Але не так многа з іх ведае, што ў паэтычным свеце прысутнічае яшчэ і паэтычнае слова Вячаслава Рагойшы – своеасаблівае падсумаванне яго навуковых літаратуразнаўчых пошукаў.

«Полюс цяпла» – невялічкая, густоўна аформленая кніга, якая выйшла ў 2007 годзе ў выдавецтве «Кнігазбор», – змяшчае паэтычныя тэксты, створаныя на працягу амаль паўвеку: з 1958 па 2006 гг. Агульнае, што аб’ядноўвае гэтыя творы, як падкрэслена ў анатацыі – «гэта выяўленне любові да роднага кута, Бацькаўшчыны Беларусі, яе людзей, да роднай мовы, жанчыны» [1, с. 2]. І гэта, сапраўды так, бо сама назва кнігі скіроўвае «компас» нашага сэрца, кажучы словамі паэта, «на полюс цяпла – Беларусь», таму і назва першага раздзела гучыць вымоўна – «Жыве Беларусь». Вершы, змешчаныя тут, прамаўляюць да сэрца і свядомасці чытача роднымі вобразамі, знаёмымі з дзяцінства пейзажамі, беларускімі геаграфічнымі назвамі, асацыяцыямі з гістарычнай спадчыны.

Беларусь Вячаслава Рагойшы з аднаго боку, традыцыйна лірычная, знаёмая кожнаму рамантычна-ўзнёслым, у нейкай ступені нацыянальна стэрэатыпным вобразам:

Туманы па-над Нёманам волкія,
Нібы статкі, плывуць пад гару.
Русакосая, сінявокая,
Прыгажуня мая Беларусь [1, с. 6].

Але побач з гэтым Айчына для паэта – загадкавая, зашыфраваная ў страсвецкіх павер’ях і нацыянальна-міфалагічных кодах, скіраваная ў трансдэнтнае і вечнае:

Гамоняць сосны Налібокаў:
– Я дакранаюся аблокаў,
Мяне віхуры не змаглі –
Мне мачтай быць на караблі! <...>

Гамоняць сосны Налібокаў:
– Я не імкнуся так далёка.
Хай не пачую звон струны –
Патрэбны й дошкі для труны… [1, с. 8]

Некалі А. Разанаў у «Адказах на анкету “Вобраз-90”» сказаў: «Беларусь – у каранях, у матрыцы, у мацярынстве: яна ўсё яшчэ не спраўджаная і не рэалізаваная. І таму найперш тыя творы і тыя вобразы, якія адчулі, зразумелі і выказалі тысячагодовую самаахвярную вымогу каранёў стаць лесам, адкрыцца свету, вырвацца з жаху нематы, – адчулі, зразумелі і выказалі з найбольшай паўнатой дух самой Беларусі» [3, с. 129].

«Дух самой Беларусі» – відаць, найбольш адметная рыса ўсёй беларускай паэзіі. Аднак асабліва імкненне гранічна шчыра і эмацыянальна выказаць яго стала заўважна ў паэзіі нашага часу.

У паэтычным зборніку «Полюс цяпла» ёсць верш «Рабінкі на сценах Крэўскага замка»:

Рабінкі ззяюць.
Іх карэнні
Адвечны мур перапляталі.
Ім тут,
На сонцы,
Смак каменняў
Стаў саладзей за смак зямлі.

Калі ж віхор ліхі застогне,

Захоча дрэўцы ўніз спусціць,
Яны лепш самі – у бяздонне,
Чым стануць зноў
Пад мурам жыць! [1, с. 10]

Гэта і пра чалавека, пра яго спрадвечнае імкненне да свабоды, і пра Радзіму, Беларусь, пра набалелае, пра тое, што заўсёды застаецца актуальным.

Паэтычная вобразнасць В. Рагойшы ўбірае ў сябе векавыя нацыянальныя коды, увасобленыя ў менталітэце, характары і родных ландшафтах, і дзіўным чынам актуалізуе іх, можна сказаць, прарочымі прадчуваннямі рэалізацыі беларускай матрыцы.

Настоенае ў шуме баравым
На водары верасовым,
На лекавым чаборы і на сонцы,
Яно – бальзам ад грыпу
І ад стронцыя.
Яно – віно прадзедаўскае наша,
Што ціха плешча ў край зялёнай чашы [1, с. 12].

Гэта верш «Возера Кромань», напісаны ў 1963 годзе, які сёння пасля Чарнобыльскай катастрофы набывае сімвалічны сэнс, скіроўваючы нашыя думкі да трагічнай наканаванасці нацыянальнага лёсу.

У сусветным літаратуразнаўстве існуе меркаванне, выказанае некалі, здаецца, Янам Паранадоўскім, аб тым, што на свеце бываюць два тыпы паэтаў: адны, якія чэрпаюць сваё натхненне з уласных перажыванняў і вопыту, і другія – у якіх паэтычная думка натхняецца кніжнымі вобразамі, рацыянальна аплодненым досведам знаёмства з высокай класікай. Інакш кажучы, паэты «кніжныя». Несумненна, Вячаслаў Рагойша паяднаў у сабе рысы абодвух тыпаў. І ўсё, як нам здаецца, у большай ступені ён належыць да катэгорыі «кніжнікаў». У яго паэтычных тэкстах адлюстраваны яго асабісты ўнікальны вопыт прафесійнага чытача і тэарэтыка літаратуры, што заўважна ў асацыятыўнай вобразнасці, алюзіях і выкарыстанні самых разнастайных вершаваных форм: ад класічных цвёрдых (актава, санет, трыялет) да разняволенага верлібра і ўсё яшчэ крыху экзатычнага для беларускай паэзіі танка. Альбо зусім нечаканага брахікалана, – верша, напісанага кароткімі – у адзін склад ці адну стапу – радкамі.

Мы
рабы
арбы.
Я,
што вол
рабы,
свой
ару
загон,
сею
жыта,
лён
ледзь
зіма
на згон.
Толькі ж
дзе мой
плён? [1, с. 28]

Брахікалан надзвычай рэдкі ў беарускай паэзіі від верша. І, калі не памыляюся, першым беларускім брахікаланам стаў верш Янкі Купалы «Устань» (1907), які, магчыма, і стаў для Вячаслава Пятровіча натхняльным імпульсам.

Найбуйнейшы ў краіне спецыяліст у галіне вершаскладання, Вячаслаў Рагойша нібыта цешыцца і любуецца невычэрпнымі скарбамі і магчымасцямі роднай мовы, якія выяўляюцца ў метрыцы, рытміцы, фоніцы і, безумоўна, асацыятыўнай вобразнасці.

Дзе Вы, дзядзька Якуб?
Я змагу з Вамі ўрэшце сустрэцца!
Мне сказалі ў Смольні,
Што косіце Вы паплавы…
Знічка долу спадзе
І ў сотнях расінак мільгнецца.
І сама расцярушыцца
Ў шчэці калючым травы [1, с. 24].

Добра вядома, што спрадвечныя ісціны і аксіялагічныя каштоўнасці, тое, што мы называем агульначалавечым здабыткам, у літаратуры выяўляецца перш за ўсё на мясцовым нацыянальным узроўні. Хрысціянская трыяда светабудовы – гэта ўзровень не толькі быцця, але і побыту.

Чалавек –народ – чалавецтва; жанчына-маці – родны кут, роднае карэнне – Зямля, як агульначалавечы дом – усё гэта заўжды было і застаецца адзіным шляхам сапраўднай вялікай літаратуры. Аднак сёння ў перыяд глабалізацыі, першапачатковыя кропкі адліку, як ніколі раней актуалізаваліся.

Кніга «Полюс цяпла» Вячаслава Рагойшы прысвечана «вернай сяброўцы <…> жыцця, жонцы Таццяне Вячаславаўне Кабржыцкай». І сапраўды, самыя прачулыя, эмацыянальныя, светлыя і шчымлівыя радкі ў гэтым зборніку з’яднаныя з яе вобразам і асобай:

Напэўна, салёная пырска марская
Ў Адэсе мне трапіла неяк у вока.
Ад Чорнага мора цяпер я далёка,
Але як сустрэчы з табой прыгадаю –
Мне кропля салёная зрок засцілае [1, с. 54].

Гэта адзін з самых ранніх вершаў (1962 года), прысвечаны Таццяне Вячаславаўне, аднак у кнізе цэлая нізка пад вымоўнаю назвай «Я – месяц твой» – своеасаблівы гімн шчасліваму каханню і непарыўнай еднасці душ.

Добрая раніца! Сваркі канчаюцца,
Зло прабачаецца, людзі ўсміхаюцца,
Ад таямніцы жыцця прычашчаюцца.

… Я не стрываў – я прыйшоў гэткай раніцай
Аб запаветным з таброю параіцца.
Добрай нам раніцы! [1, с. 56]

Характэрна, што завяршае гэты унікальны раздзел верш «Беларускім жанчынам»:

Ні ў якіх пажарах, ні ў якіх залевах
Народ наш
Прыгожы
Не згіне,
Бо што ні дзяўчына ў нас –
Каралева,
А што ні кабета –
Багіня! [1, с. 80]

Яшчэ адзін скразны матыў паэтычнай кнігі Вячаслава Рагойшы непасрэдным чынам з’яднаны з творчым воблікам Таццяны Вячаславаўны Кабржыцкай – слаўнай дачкі украінаскага народа – гэта Украіна, яе прырода, людзі, гісторыя і літаратура. Пра тое, што Беларусь і Украіна ў свядомасці і жыццёвым лёсе Вячаслава Рагойшы знітаваныя ў адно цэлае, што, кажучы словамі Адама Міцкевіча «на дзве радзімы яго сэрца», вобразна прамаўляе верш «Трызуб».

«У Украіне светлай,
Дзе я ўміраю
У белым доме,
Ля сіняй бухты…»
Мне здаецца,
Менавіта так
Пачаў у Ялце
У маі 1917 года
Свой апошні верш
Максім Багдановіч,
Прароча ўбачыўшы
У жоўтай дзянніцы
Блакітнага неба
Над вяршыняй Ай-Петры
Украінскі Трызуб [1, с. 43].

Гартаючы старонкі паэтычнага зборніка «Полюс цяпла» нельга пазбыцца адчування непасрэднай далучанасці да жыццёвага і творчага лёсу яе аўтара. Здаецца, што разам з ім перажываеш яго першыя юнацкія захапленні літаратурай, яго вялікае каханне, яго патрыятызм, яго навуковае спазнанне вялікага свету класічнай беларускай паэзіі. Ніхто ў беларускім літаратуразнаўстве не сказаў больш за Вячаслава Пятровіча Рагойшу пра спецыфіку «паэтычнага рамяства», якое неабходна кожнаму паэту, бо «трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, / Абрабіць яго трэба з цярпеннем». Ён настаўнік для тых, хто хоць на кароткі час далучыўся да чароўнага свету паэзіі.

І невыпадкова на прасторах сусветнай сеткі Інтэрнэт гуляе і карыстаецца вялікай папулярнасцю тэкст Міхала Анемпадыстава «Настаўнік Рагойша»:

Тысяча дзевяцьсот дваццаць шосты год.
Мястэчка Ракаў пры панскай Польшчы.
У цэнтры – плошча, на плошчы – касцёл,

Па плошчы ідзе настаўнік Рагойша.
Ён апрануты па апошняй модзе
На ім галіфэ, камізэлька ды гальштук,
на ім – акуляры ды новыя боты
(новыя боты новай работы).
Сам ён – тутэйшы, вярнуўся нядаўна,
вучыўся на фізыка ў Ротэрдаме [3, с. 8].

Канешне, сёння далёка не 1926 г., а амаль на сто год далей. І той настаўнік-фізік Рагойша – не наш Вячаслаў Пятровіч. Але жыве беларуская матрыца! Па-ранейшаму прываблівае беларусаў і замежных турыстаў старасвецкае мястэчка Ракаў, з касцёлам на галоўнай плошчы. А там час ад часу шпацыруе «апрануты па апошняй модзе», народжаны ў гэтым мястэчку мой настаўнік і настаўнік многіх беларусаў [1, с. 8] – літаратуразнаўцаў, паэтаў, выкладчыкаў Вячаслаў Пятровіч Рагойша. Чалавек энцыклапедычных ведаў, навуковец і паэт у адной асобе.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Рагойша В. Полюс цяпла, Мінск:Кнігазбор, 2007.
2. Настаўнік Рагойша [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://spevy.by/songs/album/nastaunik-rahojsha/. Дата доступу: 09.06.2022.
3. 3. Тычко Г. К. Асновы літаратурна-мастацкай творчасці: Вучэбна-метадычны комплекс / Г. К. Тычко. Мн., БДУ, 2005.

## КАБ ВЕДАЛІ ГІСТОРЫЮ «МАЛОЙ РАДЗІМЫ»

**П. Л. Дарашчонак**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт.*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Беларусь,*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

*У артыкуле вядзецца гаворка пра культурна-асветніцкія праекты доктара філалагічных навук прафесара В. П. Рагойшы, прысвечаныя даследаванню і папулярызацыі гісторыі і культурнага жыцця старажытнага мястэчка Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці.*

***Ключавыя словы***: гістарычная памяць; Ракаўскія чытанні; краязнаўства; культурныя ўзаемасувязі; славутыя землякі; газета «Ракаўскі шлях».